# Выпушчаныя ў абарачэнне дзве паштовыя маркі з серыі «EUROPA»

5 мая 2020 года Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпушчана ў абарачэнне дзве паштовыя маркі з серыі «EUROPA».

Праект «Старажытныя паштовыя маршруты» падрыхтаваны па матэрыялах Гісторыка-інфармацыйнага цэнтра паштовай сувязі РУП "Белпошта" (Фрагменты малюнкаў В. Сташчанюка) і ў супрацоўніцтве з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі.

Акрамя таго, да гэтага выпуску падрыхтаваны карткі для картмаксімусаў. Мастак В. Сташчанюк. Дызайн паштовай прадукцыі Таццяны Кавалёвай.

Неабходнасць у атрыманні вестак з іншых мясцовасцяў і краін узыходзіць да глыбокай старажытнасці. Першапачаткова дастаўка пісьмовых і вусных паведамленняў ажыццяўлялася ганцамі альбо пасламі.

На марках прадстаўленыя паштовыя маршруты:
«Вільня - Маладзечна - Менск - Барысаў - Друцк - Орша - Смаленск»;
«Кракаў - Варшава - Горадня - Вільня».

Да паштовай марцы № 1345 на якой паказаны паштовы маршрут «Кракаў - Варшава - Горадня - Вільня », зацверджаны вялікім князем літоўскім Стэфанам Баторыем у 1583 годзе, прыменена тэхналогія дапоўненай рэальнасці. Пры навядзенні на паштовую марку камеры смартфона з запушчаным дадаткам AR MARKA BELARUS з'яўляецца спецыяльна створаны сцэнар.

Падрабязнасці на сайце РУП «Белпошта»

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/05-05-2020-6299*